# СТАТУТ

## БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ АДВАКАТАЎ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

*(Са змяненнямі, прынятымі рашэннямі Агульнага Сходу № 24/05/10 і № 24/05/10-2 ад 10 траўня 2024 года)*

## ПРЭАМБУЛА

Усведамляючы каштоўнасць правоў чалавека і асноўных свабод, прымаючы да ўвагі неабходнасць абароны правоў і свабод чалавека не толькі ўладай закона, але і незалежнай супольнасцю кваліфікаваных адвакат_ак, як часткай любога дэмакратычнага грамадства, улічваючы, што абарона гэтых правоў і свабод мае вялікае значэнне для захавання прынцыпу вяршэнства права і з'яўляецца безумоўным прыярытэтам любой свабоднай супольнасці незалежных адвакат_ак, усведамляючы высокія патрабаванні да прафесіі адвакат_кі, адзначаючы неабходнасць забеспячэння свабоды і незалежнасці адвакацкай дзейнасці, мы – адвакат_кі правоў чалавека, прымаем дадзены Статут з мэтай структурнага ўладкавання і рэгулявання дзейнасці створанай намі Беларускай асацыяцыі адвакат_ак правоў чалавека.

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Беларуская асацыяцыя адвакатаў правоў чалавека

1. Беларуская асацыяцыя адвакатаў правоў чалавека (далей – Асацыяцыя) – гэта некамерцыйная супольнасць адвакат_ак правоў чалавека, аб’яднаная агульнымі каштоўнасцямі, місіяй і мэтамі.

2. Каштоўнасцямі Асацыяцыі з’яўляюцца:

- незалежнасць;
- прафесіяналізм;
- прыхільнасць вяршэнству права і правам чалавека;

- нягвалт;
- недыскрымінацыя;
- прыярытэт індывідуальных інтарэсаў над грамадскімі;
- добраахвотнасць сяброўства;
- добрасумленнасць і адказнасць;
- канфідэнцыйнасць як сяброўства, так і аказання прававой дапамогі.

3. Місіяй Асацыцыі з’яўляецца аднаўленне і далейшае захаванне беларускай адвакатуры як незалежнага інстытута ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека.

4. Мэтамі Асацыяцыі з’яўляюцца:

a) рэпрэзентацыя інтарэсаў сябр_овак Асацыяцыі па ўсіх пытаннях, звязаных з ажыццяўленнем прафесіі адвакат_кі правоў чалавека, вяршэнствам закона і належным адпраўленнем правасуддзя, а таксама з важнымі зменамі ў заканадаўстве і судовай практыцы, як на еўрапейскім, так і на міжнародным узроўні;

b) прызнанне за Асацыяцыяй права выступаць ад імя незалежнай адвакатуры Беларусі;

c) дапамога беларускім адвакат_кам, а таксама спрыянне стварэнню бяспечнага для адвакат_ак правоў чалавека асяроддзя ў цэлым;

d) абарона адвакатаў_ак, якія пераследуюцца па палітычных матывах, шляхам рэагавання на канкрэтныя справы, а таксама прыцягнення ўвагі да пераследу адвакат_ак у цэлым;

e) захаванне экспертнага і прафесійнага патэнцыялу сябр_овак Асацыяцыі і спрыянне яго росту з магчымым будучым навучаннем новага пакалення прафесійных юрыст_ак;

f) абарона вяршэнства права, асноўных правоў і свабод чалавека, у тым ліку права на доступ да правасуддзя і права на абарону, а таксама абарона дэмакратычных каштоўнасцяў, непарыўна звязаных з гэтымі правамі.

5. У сваёй дзейнасці і ўнутранай арганізацыі Асацыцыя прытрымліваецца прынцыпаў палітычнай і эканамічнай незалежнасці, устойлівага развіцця, павагі да правоў чалавека, разнастайнасці і інклюзіўнасці.

6. Дзейнасць, якую Асацыяцыя імкнецца ажыццяўляць для рэалізацыі сваіх мэтаў, у прыватнасці, уключае ў сябе:

a) аналітычная дзейнасць наконт стану беларускай адвакатуры і права на справядлівы суд ў Беларусі;

b) арганізацыя, садзеянне правядзенню і фінансаванне канферэнцый і навучальных мерапрыемстваў;

c) падрыхтоўка ці ўдзел у падрыхтоўцы праектаў прававых дакументаў у сферы рэгулявання адвакатуры і судовай сістэмы;

d) арганізацыя сустрэч і дыскусійных форумаў, скіраваных на адвакатаванне праблем беларускай адвакатуры і правоў чалавека;

e) усталяванне кантактаў і дыялог з прадстаўні_цамі адвакацкай прафесіі, а таксама з еўрапейскімі і міжнароднымі інстытуцыямі і судамі;

f) стварэнне базаў даных і бібліятэк, правядзенне даследаванняў;

g) публікацыя пісьмовых дакументаў і паведамленняў, у прыватнасці, артыкулаў, каментароў, аналітычных матэрыялаў, выкладанне пазіцыі, прэс-рэлізаў, статыстычных дадзеных, прапаноў па прававых або нарматыўных дакументах;

h) аказанне дапамогі сябр_оўкам асацыяцыі, уключаючы матэрыяльную дапамогу ім і іх блізкім, дапамогу па пытаннях міграцыі, садзеянне атрыманню псіхалагічнай дапамогі, звароты ў міжнародныя арганізацыі і іншыя структуры у абарону адвакат_ак Беларусі;

i) супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, партнёрскімі арганізацыіямі і іншымі структурамі ў падрыхтоўцы дакладаў, справаздач, заключэнняў па пытаннях сітуацыі з правамі чалавека і стану адвакатуры ў Беларусі;

j) аказанне дапамогі беларускім адвакат_кам, уключаючы матэрыяльную дапамогу ім і іх блізкім, дапамогу па пытаннях міграцыі, садзеянне атрыманню псіхалагічнай дапамогі;

k) распрацоўка, падтрымка і распаўсюджанне стандартаў і этычных правілаў дзейнасці адвакат_ак правоў чалавека;

l) іншая дзейнасць, якая не супярэчыць мэтам Асацыяцыі.

7. Асацыяцыя мае права выконваць любыя дзеянні, непасрэдна ці ўскосна звязаныя з яе мэтамі. Акрамя таго, яна мае права ў адпаведнасці з прававымі актамі набываць або адчужаць асабістую або нерухомую маёмасць, заключаць дамовы і прымаць любыя ахвяраванні, у тым ліку паводле тэстаманту, калі гэта прама або ўскосна звязана з яе мэтамі.

## Структура Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

8. Беларуская асацыяцыя адвакатаў правоў чалавека мае наступныя органы самакіравання:

- Агульны Сход Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей – Агульны Сход);
- Рада Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей – Рада);
- Камісія па этыцы Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей – Камісія па этыцы)
- Арбітраж па этыцы Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей – Арбітраж);
- Назіральная Камісія Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей - Назіральная Камісія).

9. Асацыяцыя прадугледжвае наступныя пасады:

- Сябр_оўка Рады;
- Прэзідэнт_ка Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей - прэзідэнт_ка);
- Выканаўч_ая дырэктар_ка Беларускай Асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей – выканаўч_ая дырэктар_ка);
- Старшыня Камісіі па этыцы;
- Сябр_оўка Камісіі па этыцы;

- Старшыня Арбітража;
- Сябр_оўка Арбітража;
- Старшыня Назіральнай Камісіі;
- Сябр_оўка Назіральнай Камісіі.

# СЯБРОЎСТВА Ў АСАЦЫЯЦЫІ

## Патрабаванні да сябр_оўкі Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

10. Асацыяцыя предугледжвае фіксаванае сяброўства праз вядзенне спіса сябр_овак у электроннай базе дадзеных. Спіс складае і вядзе Выканаўч_ая дырэктар_ка.

11. Сябр_оўкай Асацыяцыі можа стаць асоба, якая адначасова адпавядае наступным умовам:
- наяўнасць вышэйшай юрыдычнай адукацыі (у выключных выпадках дапускаецца наяўнасць іншага віду юрыдычнай адукацыі);
- наяўнасць базавых кампетэнцый у сферы правоў чалавека;_
- становучая рэпутацыя;
- адданасць каштоўнасцям Асацыяцыі і намер працаваць дзеля дасягнення яе місіі і мэтаў.

## Правы і абавязкі сябр_оўкі Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

12. Кожн_ая сябр_оўка Асацыяцыі мае права:
- прымаць удзел у дзейнасці Асацыяцыі і абмеркаваннях любых пытанняў, з ёй звязаных, у адпаведнасці з прадугледжаннымі Статутам працэдурамі дзейнасці органаў Асацыяцыі;
- галасаваць на Агульным сходзе і быць абраным на пасаду ў органы самакіравання Асацыяцыі;
- звяртацца да органаў Асацыяцыі па дапамогу, абарону я_е правоў і законных інтраэсаў;
- уносіць прапановы і ставіць пытанні перад Асацыяцыяй, разам з іншымі сябр_оўкамі Асацыяцыі ініцыяваць скліканне пазачарговага Агульнага Схода;
- быць інфармаваным органамі Асацыяцыі аб іх дзейнасці згодна са Статутам;
- уносіць любыя прапановы усім выбарным органам Асацыяцыі па пытаннях, якія адносяцца да іх кампетэнцыі;
- прымаць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца Асацыяцыяй;
- асабіста прымаць удзел пры абмеркаванні пытанняў, датычных я_е правоў і абавязкаў.

- выйсці з Асацыяцыі ў любы час.

13. Кожн_ая сябр_оўка Асацыяцыі нясе наступныя абавязкі:

- прытрымлівацца каштоўнасцяў і этычных патрабаванняў Асацыяцыі;
- не ажыццяўляць дзейнасць, якая супярэчыць місіі і мэтам Асацыяцыі;
- адказна і старанна выконваць задачы, на якія ён ці яна пагадзіўся;
- пастаянна ўдасканальваць свае прафесійныя веды;
- аплочваць сяброўскія ўзносы ў Асацыяцыю;
- выконваць патрабаванні Статута;
- выконваць рашэнні органаў Асацыяцыі, прынятыя ў межах іх кампетэнцыі;
- не здзяйсняць дзеянняў ды учынкаў, якія могуць падрываць аўтарытэт Асацыяцыі альбо шкодзіць яе дзелавой рэпутацыі;
- прытрымлівацца ўнутраных правілаў узаемадзеяння, прынятых ў Асацыяцыі.

## Парадак прыёму ў сябр_оўкі Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

14. Для ўступлення ў сябр_оўкі Асацыяцыі кандыдат_ка мусіць звярнуцца на адрас Рады з адпаведнай заявай, да якой прыкласці рэзюмэ, дакумент аб наяўнасці вышэйшай юрыдычнай адукацыі, 2 рэкамендацыйныя лісты ад асоб, якія могуць пацвердзіць кампетэнтнасць і рэпутацыю кандыдат_кі. Такімі асобамі могуць быць кваліфікаваныя спецыяліст_кі ў сферы права, вядомыя праваабаронцы, асобы, якія заслужваюць даверу дзякуючы сваёй праваабарончай дзейнасці.

15. Пры паступленні заявы і пералічаных дакументаў Рада не пазней за 3 працоўныя дні паведамляе пра гэта ўсім сябр_оўкам Асацыяцыі і прапаноўвае на працягу 5 працоўных дзён даслаць свае меркаванні наконт магчымасці прыняцца кандыдат_кі ў сябр_оўкі Асацыяцыі або наяўнасці для гэтага перашкод. У выпадку, калі сябр_оўкі Асацыяцыі не выказалі свайго меркавання ў прызначаны тэрмін, лічыцца, што ім невядома пра перашкоды для прыняцца кандыдат_кі ў сябр_оўкі Асацыяцыі. У выпадку, калі ад сябро_вак паступілі звесткі, якія супярэчаць звесткам, пададзеным кандыдат_кай, Рада можа запатрабаваць дадатковыя дакументы і іншыя матэрыялы ад кандыдат_кі ці ад сябр_оўкі Асацыяцыі.

16. Па сканчэнні тэрміну для выказвання меркавання сябр_оўкамі Асацыяцыі Рада прызначае сумоўе з кандыдат_кай. Сумоўе мусіць быць праведзена не пазней за 15 працоўных дзён з моманту падачы заявы. Кандыдат_цы паведамляецца пра дату і час сумоўя не пазней, чым за 5 працоўных дзён да яго правядзення. Сумоўе праводзіцца з мэтай пацверджання звестак, якія кандыдат_ка прадстаўі_ла пра сябе пры падачы заявы на ўступленне ў Асацыяцыю, а таксама звестак, прадстаўленых сябр_оўкамі Асацыяцыі ў дачыненні да кандыдат_кі. Сумоўе праводзіць Рада, якая можа запрашаць да ўдзелу ў сумоўі іншых сябро_овак Асацыяцыі, а таксама прадстаўні_ц арганізацый-партнёраў, вядомых праваабаронцаў, навуко_вак і іншых асоб, кампетэнтных ў пытаннях правоў чалавека.

17. На падставе вынікаў сумоўя, пададзеных кандыдат_кай дакументаў і меркаванняў сябро_вак Асацыяцыі Рада выносіць рашэнне аб прыняцці кандыдат_кі ў сябр_оўкі Асацыяцыі або аб адмове ў гэтым. Рашэнне аб адмове мусіць быць матываваным. Рашэнне мусіць быць вынесена не пазней за 3 працоўныя дні пасля сумоўя.

18. Заснавальні_цы Асацыяцыі лічацца сябр_оўкамі Асацыяцыі з моманту стварэння Асацыяцыі.

### Выключэнне сябр_оўкі з Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

19. Выключэнне сябр_оўкі з Асацыяцыі адбываецца ў наступных выпадках:

a) накіравання ў Раду сябр_оўкай Асацыяцыі заявы аб выхадзе з Асацыяцыі;

b) уступлення ў сілу рашэння Камісіі па этыцы аб выключэнні сябр_оўкі Асацыяцыі з Асацыяцыі;

c) уступлення ў сілу пастановы Арбітража аб выключэнні сябр_оўкі Асацыяцыі з Асацыяцыі;

d) смерці сябр_оўкі Асацыяцыі або страты ёй_ім дзеяздольнасці, пацверджанай рашэннем суда.

e) нявыплата сяброўскіх узносаў на працягу 3 месяцаў

20. Рашэнне аб выключэнні сябр_оўкі з Асацыяцыіі ў выпадках, прадугледжанных падпунктамі а), d) і е) пункта 19, прымаецца Радай не пазней за 3 працоўныя дні з моманту, калі ёй сталі вядомыя вышэйпаказаныя абставіны.

## ОРГАНЫ САМАКІРАВАННЯ І ПАСАДЫ Ў АСАЦЫЯЦЫІ

### Агульны Сход Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

21. Агульны Сход - найвышэйшы орган самакіравання Асацыяцыі.

22. Агульны Сход мае права прымаць рашэнні па любых пытаннях, звязаных з дзейнасцю Асацыяцыі. Рашэнні Агульнага Сходу не павінны супярэчыць каштоўнасцям, місіі і мэтам Асацыяцыі.

23. На Агульным сходзе па запрашэнні Асацыяцыі могуць прысутнічаць асобы, якія не з’яўляюцца сябр_оўкамі Асацыяцыі, але яны не маюць права ўдзельнічаць у галасаванні.

24. У выключную кампетэнцыю Агульнага Сходу ўваходзяць наступныя пытаннні:

- прыняцце і скасаванне статутных дакументаў, унясенне ў іх зменаў;
- прыняцце этычных стандартаў Асацыяцыі, унясенне ў іх зменаў;

- абранне сябр_овак Асацыяцыі ў склад Рады, Камісіі па этыцы, Арбітража, Назіральнай камісіі, на пасаду прэзідэнт_кі, зацвярджэнне на пасаду выканаўч_айдырэктар_кі,датэрміноваеспыненнеіхпаўнамоцтваў, вызваленне ад гэтых пасадаў па заяве;

- усталяванне памераў сяброўскіх узносаў і перыядычнасці іх аплаты;

- зацвярджэнне справаздач, падрыхтаваных Радай і Назіральнай Камісіяй;

- прыпыненне дзейнасці або роспуск Асацыяцыі.

25. Рашэнні Агульнага Сходу маюць найбольшую юрыдычную сілу сярод усіх рашэнняў органаў Асацыяцыі. Агульны Сход можа адмяніць рашэнне любога іншага органа Асацыяцыі, акрамя рашэння Камісіі па этыцы і пастановы Арбітража.

26. Агульны Сход праводзіцца ў вочнай форме або ў рэжыме онлайн-канферэнцыі.

27. Агульны Сход лічыцца паўнамоцным, калі ў ім удзельнічаюць не менш за 2⁄3 ад агульнай колькасці сябр_овак Асацыяцыі. У выпадку правядзення пасяджэння Агульнага Сходу для абрання складу Арбітража (пункт $60^3$ Статута), Агульны Сход лічыцца паўнамоцным, калі ў ім удзельнічаюць не менш за 2⁄3 ад колькасці сябр_овак Асацыяцыі, якія правамоцны абіраць склад Арбітража.

28. На Агульным Сходзе кожны сяб_роўка Асацыяцыі мае адзін голас.

29. Рашэнні Агульнага Сходу прымаюцца простай большасцю (больш за 1/2) галасоў яго ўдзельні_ц.

30. Агульны Сход склікаецца Радай:

- не менш за адзін раз на год (штогадовы Сход), а таксама ў выпадках, калі Рада прызнае гэта неабходным;

- па ініцыятыве не менш як ⅓ сябро_вак Асацыяцыі - не пазней за месяц з моманту давядзення да Рады такой ініцыятывы.

31. Рада апавяшчае ўсіх сябро_вак Асацыяцыі аб правядзенні Агульнага Сходу не пазней чым за 7 дзён да правядзення Агульнага Сходу. Гэтае паведамленне мусіць змяшчаць дату, час, месца (у выпадку онлайн-канферэнцыі - спосаб сувязі) правядзення Агульнага Сходу і спіс пытанняў, якія выносяцца на разгляд Агульнага Сходу. Непасрэдна падчас Агульнага Сходу кожн_ая яго ўдзельні_ца мае права дадаткова вынесці на разгляд свае пытанні. Такія пытанні прымаюцца да разгляду, калі за гэта прагаласуе не менш за ½ удзельні_ц Агульнага Сходу.

32. На час правядзення Агульнага Сходу з ліку яго ўдзельні_ц абіраюцца Старшыня Агульнага Сходу і Сакратар_ка Агульнага Сходу. Старшыня вядзе Агульны Сход, у тым ліку ставіць пытанні на галасаванне і абвяшчае прынятыя рашэнні. Сакратар_ка вядзе пратакол, у якім адзначае ўсе прынятыя Агульным Сходам рашэнні. Пратакол Агульнага Сходу публікуецца Выканаўч_ай дырэктар_кай Асацыяцыі не пазней за 24 гадзіны пасля завяршэння Агульнага Сходу ў спецыяльна прызначаным для гэтага закрытым тэлеграм-канале.

33. Пратакол Агульнага Сходу падпісваюцца Сакратар_кай Агульнага Сходу і Старшынёй Агульнага Сходу.

## Рада Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

34. Рада з’яўляецца распарадчым і выканаўчым органам Асацыяцыі, склад якога абіраецца і зацвярджаецца Агульным Сходам.

35. У склад Рады ўваходзяць сябр_оўкі Рады і прэзідэнт_ка Асацыяцыі, як_ая аўтаматычна пасля я_е абрання лічыцца сябр_оўкай Рады. Колькасць сябро_вак Рады вызначаецца Агульным Сходам пры правядзенні выбараў у новы склад Рады ў залежнасці ад агульнай колькасці сябро_вак Асацыяцыі і іншых акалічнасцяў, але гэтая колькасць заўсёды мусіць уяўляць сабой няцотны лік і быць не меншай за 5.

36. Паседжанні Рады збіраюцца па меры неабходнасці, але не радзей чым 1 раз на месяц.

37. Тэрмін паўнамоцтваў Рады складае два гады. Падчас гэтага тэрміну люб_ая я_е сяб_роўка можа быць адклікана Агульным Сходам або падаць у адстаўку. У такім выпадку, а таксама ў выпадку вызвалення пасады сябр_оўкі Рады ў сувязі з выключэннем я_е з Асацыяцыі, Агульны Сход абірае нов_ую сябр_оўку Рады на тэрмін да правядзення новых выбараў Рады.

38. Адкліканне сябр_оўкі Рады ажыццяўляецца Агульным Сходам, які склікаецца па ініцыятыве не менш як ⅓ сябро_вак Асацыяцыі.

39. Адстаўка сябр_оўкі Рады прымаецца Агульным Сходам, які склікаецца Радай не пазней за 1 месяц пасля атрымання Радай заявы аб адстаўцы. Заява аб адстаўцы можа быць адклікана да моманту прыняцця адстаўкі.

40. Агульны Сход, на якім разглядаецца пытанне аб адкліканні ці адстаўцы сябр_оўкі Рады, пры станоўчым рашэнні павінен разгледзець і пытанне аб выбарах новага сябр_оўкі ў склад Рады.

41. Да кампетенцыі Рады адносяцца наступныя пытанні:

- арганізацыя выканання рашэнняў Агульнага Сходу;
- вызначэнне і арганізацыя працы для сябро_вак Асацыяцыі;
- прыняцце рашэнняў аб падпісанні дамоваў ад імя Асацыяцыі;
- арганізацыя і ўдзел ў мерапрыемствах (саммітах, канферэнцыях, семінарах, сессіях і інш.);
- распараджэнне сродкамі Асацыяцыі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі;
- прыняцце рашэнняў па іншых пытаннях дзейнасці Асацыяцыі, якія не датычацца да выключнай кампетэнцыі Агульнага Сходу.

42. Рашэнні Рады прымаюцца галасаваннем, у якім кожн_ая сябр_оўка і прэзідэнт_ка мае адзін голас. Працэдура і форма прыняцця рашэнняў вызначаецца Радай па дамоўленасці між яе сябр_оўкамі. Рашэнні даводзяцца да ведама сябро_овак Асацыяцыі не пазней за 1 працоўны дзень пасля іх прыняцця.

43. Любыя рашэнні Рады могуць быць перагледжаныя Агульным Сходам па ініцыятыве не менш як ⅓ сябро_вак Асацыяцыі. Рада абавязаная

склікаць Агульны Сход не пазней за 1 месяц з моманту давядзення да Рады такой ініцыятывы. Скліканне Агульнага Сходу перапыняе дзеянне рашэння Рады на перыяд да яго правядзення. Агульны Сход можа прыняць рашэнне аб згодзе з рашэннем Рады або аб яго адмене ці змяненні.

44. На пасяджэннях Рады павін_на прысутнічаць выканаўч_ая дырэктар_ка, як_ая выконвае ролю сакратар_кі. У выпадку адсутнасці выканаўча_й дырэктар_кі па прычынах, прызнаных Радай абгрунтаванымі, роля сакратар_кі ўскладаецца на адн_у з сябро_вак Рады. Па запрашэнні Рады ў яе паседжаннях могуць прымаць удзел іншыя асобы без права голасу.

45. Права і парадак падпісання дакументаў ад імя Рады вызначаецца паводле пагаднення між яе сябр_оўкамі.

## Прэзідэнт_ка Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

46. Прэзідэнт_ка з’яўляецца адн_ой з сябро_овак Рады і прадстаўні_цай Асацыяцыі ў стасунках з партнерамі, арганізацыямі, дзяржаўнымі органамі і іншымі. Пры прыняцці Радай рашэнняў меркаванне і голас прэзідэнта_кі з’яўляецца роўным з галасамі іншых сябро_вак Рады. Прэзідэнт_ка валодае высокімі маральнымі якасцямі і аўтарытэтам сярод калег.

47. Прэзідэнт_ка робіць публічныя заявы ад імя Асацыяцыі, падпісвае дакументы, рэпрэзентуе Асацыяцыю на мерапрыемствах.

48. Прэзідэнт_ка абіраецца на тэрмін два гады і можа займаць гэтую пасаду не больш за два тэрміны запар.

49. Прэзідэнт_ка падпарадкоўваецца рашэнням органаў самакіравання Асацыяцыі і не можа выходзіць за межы прынятых рашэнняў.

50. Прэзідэнт_ка мае наступныя паўнамоцтва:

- удзельнічае ў працы Рады;
- дзейнічае ад імя Асацыяцыі на падставе рашэнняў Рады без даверанасці;
- выдае даверанасці па ўзгадненні з Радай;
- на падставе рашэнняў Рады заключае необходныя дамовы, кантракты, пагадненні;
- вырашае іншыя пытанні, датычныя дзейнасці Асацыяцыі ў адпаведнасці са Статутам.

## Камісія па этыцы Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

51. Камісія па этыцы з'яўляецца органам Асацыяцыі, які разглядае пытанні прыцягнення сябро_вак Асацыяцыі да адказнасці за парушэнне этычных патрабаванняў Асацыяцыі.

52. Камісія па этыцы складаецца з трох сябро_вак Асацыяцыі, ў тым ліку Старшыні, якія абіраюцца Агульным Сходам на тэрмін два гады. Сябр_оўка Камісіі па этыцы не можа быць адклікан_ая Агульным Сходам. Паўнамоцтвы сябр_оўкі Камісіі па этыцы могуць быть скончаны

датэрмінова ў выпадку падачы ёй у адстаўку па важкіх прычынах і прыняцця гэтай адстаўкі Агульным сходам, а таксама ў выпадку выключэння яе са складу Асацыяцыі. У такім выпадку Агульны Сход абірае новага сябр_оўку Камісіі па этыцы на тэрмін да правядзення новых выбараў Камісіі па этыцы.

53. Сябр_оўка Камісіі па этыцы не можа адначасова з'яўляцца сябр_оўкай Рады, Прэзідэнт_кай, сябр_оўкай Назіральнай камісіі.

54. Камісія па этыцы ўзбуджае дысцыплінарную працэдуру ў дачыненні да сябр_оўкі Асацыяцыі ў выпадку:

- паступлення скаргі, пададзенай у Асацыяцыю любой асобай (як сябр_оўкай Асацыяцыі, так і трэцімі асобамі), чые правы закранутыя ў выніку меркаванага парушэння сябр_оўкай Асацыяцыі этычных стандартаў Асацыяцыі;
- паступлення заявы Рады аб меркаваным парушэнні сябр_оўкай Асацыяцыі этычных стандартаў Асацыяцыі.

55. Скарга або заява Рады можа быць пададзена на працягу 12 месяцаў з моманту ўчынення меркаванай дысцыплінарнай правіны, да якой адносіцца скарга або заява Рады. Падача скаргі або заявы Рады па-за дванаццацімесячным тэрмінам з'яўляецца падставай для адмовы ва ўзбуджэнні ці спыненне пачатай дысцыплінарнай працэдуры. Рашэнне аб узбуджэнні ці аб адмове ва ўзбуджэнні дысцыплінарнай працэдуры прымаецца на працягу 5 дзён з моманту падачы скаргі. Па пачатай дысцыплінарнай працэдуры рашэнне прымаецца на працягу двух месяцаў з моманту ўзбуджэння дысцыплінарнай працэдуры, але не пазней за 12 месяцаў з моманту меркаванай дысцыплінарнай правіны.

56. У выпадку ўчынення правіны, не сумяшчальнай са статусам адвакат_кі правоў чалавека, рашэнне аб узбуджэнні дысцыплінарнай працэдуры можа быць прынята на працягу 12 месяцаў з моманту выяўлення дадзенай акалічнасці. Рашэнне аб узбуджэнні ці аб адмове ва ўзбуджэнні дысцыплінарнай працэдуры прымаецца на працягу 5 дзён з моманту падачы скаргі або заявы Рады. Па пачатай дысцыплінарнай працэдуры рашэнне прымаецца на працягу двух месяцаў з моманту ўзбуджэння дысцыплінарнай працэдуры, але не пазней за 12 месяцаў з моманту выяўлення правіны, не сумяшчальнай са званнем адвакат_кі правоў чалавека.

57. Сябр_оўка Асацыяцыі, чыё меркаванае парушэнне разглядаецца, а таксама заяўні_ца маюць права ўдзельнічаць у паседжэнні Каміссіі па этыцы і даваць ёй свае тлумачэнні.

58. Па выніках дысцыплінарнай працэдуры Камісія па этыцы прымае адно з наступных рашэнняў:

- аб адсутнасці складу дысцыплінарнай правіны, правіны, несумяшчальнай са статусам адвакат_кі правоў чалавека, і спыненні дысцыплінарнай працэдуры;
- аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці ў форме:

a) папярэджання / заўвагі

b) вымовы

c) выключэння з Асацыяцыі як выключнай меры дысцыплінарнай адказнасці.

59. Рашэнні Камісіі па этыцы прымаюцца большасцю галасоў яе сябр_овак. Пры нязгодзе з прынятым рашэннем унясенне ў яго асобага меркавання ажыццяўляецца пры жаданні сябр_оўкі Камісіі па этыцы. Рашэнне Камісіі па этыцы можа быць абскарджана зацікаўленымі бакамі ў Арбітраж не пазней за 1 месяц са дня яго атрымання.

60. Рашэнне Камісіі па этыцы даводзіцца да ведама сябр_овак Асацыяцыі не пазней за 1 дзень з моманту яго вынясення і ўступае ў сілу, калі ў тэрмін, вызначаны пунктам 59 Статута, не была пададзена скарга.

## Арбітраж па этыцы Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

$60^{1}$. Арбітраж з'яўляецца непастаянным органам Асацыяцыі, які разглядае скаргі на прынятае Камісіяй па этыцы рашэнне.

$60^{2}$. Абітраж складаецца з пяці асобаў – трох сябр_овак Асацыяцыі (ў тым ліку старшыні), а таксама двух запрошанах спецыяліст_ак у галіне правоў чалавека (далей – спецыяліст_кі).

$60^{3}$. Сябр_оўкі Арбітража абіраюцца Агульным Сходам, у склад якога не ўваходзяць пералічаныя ў пункце $60^{4}$ асобы. Сябр_оўкі Асацыяцыі абіраюцца ў Арбітраж пасродкам галасавання ўдзельнікаў Агульнага Сходу, а спецыяліст_кі – жэрабем з ліку асобаў, указаных у адпаведным пераліку, за вядзенне якога адказвае выканаўч_ая дырэктар_ка. Пры нязгодзе або немагчымасці ўдзелу спецыяліст_кі ў разглядзе скаргі працэдура яе/яго абрання паўтараецца.

$60^{4}$. У Арбітраж не могуць быць абраны сябр_оўкі Камісіі па этыцы, а таксама сябр_оўкі органаў і асобы, якія ініцыявалі дысцыплінарную працэдуру або іншым чынам маюць зацікаўленасць у разглядзе справы, ці з’яўляліся пацярпелымі або сведкамі парушэння.

$60^{5}$. Аплата выдаткаў у сувязі з разглядам справы Арбітражам (ў тым ліку аплата працы спецыяліст_ак) ажыццяўляецца за кошт сродкаў Асацыяцыі. Узнагарода спецыяліст_кам зацвярджаецца Радай штогод і з’яўляецца аднолькавай для ўсіх спецыяліст_ак.

$60^{6}$. Склад Арбітража павінен быць абраны не пазней за 2 месяцы са дня паступлення апошняй скаргі на рашэнне Камісіі па этыцы.

$60^{7}$. Пастанова Арбітража па скарзе на рашэнне Камісіі па этыцы павінна быць прынята не пазней за 3 месяцы са дня паступлення апошняй такой скаргі.

$60^{8}$. Асобам, якія падалі скаргі на рашэнне Камісіі па этыцы, даецца магчымасць удзельнічаць у паседжэнні Арбітража і даваць яму свае тлумачэнні.

$60^{9}$. Па выніках дысцыплінарнай працэдуры Арбітраж можа пагадзіцца з вынесеным Камісіяй па этыцы рашэннем, змяніць яго або адмяніць і вынесці новае рашэнне ў адпаведнасці з пунктам 58 Статута – аб чым прымаецца пастанова.

$60^{10}$. Пастанова Арбітража прымаецца большасцю галасоў яго складу. Пры нязгодзе з прынятай пастановай унясенне ў яе асобага меркавання

ажыццяўляецца пры жаданні сябр_оўкі Арбітража. Пастанова Арбітража можа быць абскарджана зацікаўленымі бакамі ў судовым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

60[11]. Пастанова Арбітража ўступае ў сілу ў дзень яе вынясення і даводзіцца да ведама сябр_овак Асацыяцыі не пазней за 1 дзень з моманту яе прыняцця.

## Назіральная камісія Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

61. Унутраны кантроль фінансавай і гаспадарчай дзейнасці Асацыяцыі выконвае Назіральная камісія.

62. Да кампетэнцыі Назіральнай камісіі адносіцца правядзенне праверак па ўсіх або некалькіх напрамках дзейнасці Асацыяцыі ці за пэўны перыяд яе дзейнасці. Па запыце Назіральнай камісіі Рада Асацыяцыі, Прэзідэнт_ка Асацыяцыі, Выканаўч_ая дырэктар_ка і Камісія па этыцы абавязаны перадаць усю неабходную Назіральнай камісіі інфармацыю і дакументы, у разумны тэрмін даць пісьмовыя тлумачэнні па пастаўленых пытаннях.

63. Назіральная камісія складаецца з трох сябро_вак Асацыяцыі, ў тым ліку Старшыні, якія абіраюцца Агульным сходам на тэрмін 2 гады. Сябр_оўкай Назіральнай камісіі не можа быць абраны Прэзідэнт_ка, сябр_оўкі Рады Асацыяцыі, сябр_оўкі Камісіі па этыцы. Асобы, дзейнасць якіх правяраецца, не маюць права ўдзельнічаць у правядзенні праверак па гэтых пытаннях.

64. Тэрмін паўнамоцтваў Назіральнай камісіі складае два гады. Падчас гэтага тэрміну люб_ая яе сяб_роўка можа быць адкліканы Агульным Сходам або падаць у адстаўку. У такім выпадку, а таксама ў выпадку вызвалення пасады сябр_оўкі Назіральнай камісіі ў сувязі з выключэннем яе з Асацыяцыі, Агульны Сход абірае нов_ую сябр_оўку Назіральнай камісіі на тэрмін да правядзення новых выбараў Назіральнай камісіі.

65. Абавязкамі Назіральнай каміссіі з’яўляюцца правядзенне:

- штогадовай праверкі па выніках фінансавай і гаспадарчай дзейнасці Асацыяцыі, заключэнне по якой павінна быць прадстаўлена не пазней чым за 10 дзён да даты правядзення штогадовага Агульнага Сходу;
- праверкі па рашэнні Агульнага сходу або Рады ва ўстаноўленыя імі тэрміны.

Назіральная камісія можа па асабістай ініцыятыве правесці праверку.

Праверка не можа доўжыцца больш за 30 дзён.

66. Назіральная камісія па выніках праверкі рыхтуе заключэнне.

67. Назіральная камісія ў выпадку выяўлення парушэнняў абавязана:

- падаць заключэнне па праверцы і свае прапановы Радзе, якая абавязана на працягу двух тыдняў прыняць меры па выпраўленні парушэнняў;
- патрабаваць склікання Агульнага сходу, калі па выяўленных парушэннях рашэнне можа быць прынята толькі Агульным сходам. У

выпадку паступлення такога заключэння Рада абавязаная склікаць Агульны сход не пазней за 1 месяц з моманту патрабавання Назіральнай камісіі.

68. Заключэнне Назіральнай камісіі па выніках штогадовай праверкі выносіцца на разгляд Агульнага сходу.

69. Назіральная камісія мае права звяртацца да трэціх асоб з мэтай атрымання дадатковых звестак, а са згоды Агульнага сходу – да аўдытарскіх арганізацый для правядзення праверак.

## Выканаўч_ая дырэктар_ка Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

70. Выканаўч_ая дырэктар_ка падпарадкоўваецца рашэнням Агульнага Сходу і Рады і ажыццяўляе адміністратыўна-гаспадарчую функцыю, якая, у тым ліку, заключаецца ў наступным:

- выкананне рашэнняў Рады і Агульнага Сходу;
- камунікацыя па арганізацыйных і тэхнічных пытаннях з партнер_камі, арганізацыямі, дзяржаўнымі органамі, якая па сваім характары не патрабуе непасрэднага ўдзела або рашэнняў сябро_вак Рады;
- вядзенне справаводства, архіваванне дакументаў;
- распрацоўка праектаў рашэнняў і іншых дакументаў Асацыяцыі;
- вядзенне пратаколаў паседжанняў Рады;
- арганізацыя мерапрыемстваў з удзелам сябро_вак Асацыяцыі;
- прыманне на захаванне і ажыццяўленне вопісу маёмасці;
- вядзенне фінансавага ўліку;
- вядзенне агульнага спісу сябр_овак Асацыяцыі;
- здзяйсненне фінансавых аперацый і перадача грошай і маёмасці для выканання рашэнняў Агульнага Сходу і Рады,
- падпісанне дакументаў, датычных адміністрацыйна-гаспадарчай функцыі, на падставе даверанасці, выдадзенай Прэзідэнт_кай.

71. Выканаўч_ая дырэктар_ка зацвярджаецца Агульным сходам на тэрмін два гады.

72. Па патрабаванні Назіральнай Камісіі выканаўч_ая дырэктар_ка перадае яе сябр_оўкам дакументы (іх копіі, у тым ліку электронныя), якія тычацца фінансава-гаспадарчай дзейнасці Асацыяцыі, а таксама фота- і відэа звесткі, якія дазваляюць ажыццявіць кантрольную дзейнасць. Пры неабходнасці выканаўч_ая дырэктар_ка забяспечвае бесперашкодны доступ да маёмасці і дакументаў Асацыяцыі.

## Парадак абрання на пасады і адклікання з пасад Агульным Сходам Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

73. Абранне на пасады Агульным Сходам адбываецца шляхам галасавання яго ўдзельні_ц. Галасы ўдзельні_ц Агульнага Сходу роўныя. Вылучэнне кандыдат_кі на пасаду са згоды апошня_й ажыццяўляецца па прапанове любо_й ўдзельні_цы Агульнага Сходу. Адна і тая ж асоба мае

права займаць пасаду толькі ў адным з органаў Асацыяцыі (акрамя Прэзідэнт_кі), сумяшчэнне адной асобай некалькіх пасадаў забаронена. Абранне на пасады адбываецца таемным галасаваннем.

74. Прэзідэнт_ка Асацыяцыі абіраецца Агульным Сходам з ліку сябро_вак Асацыяцыі шляхам галасавання. Лічыцца, што выбары адбыліся, калі ў іх прыняла ўдзел кваліфікаваная большасць сябро_вак Асацыяцыі (не менш ⅔ ад колькасці сяброў_вак Асацыяцыі) ў якасці выбаршчы_ц. Асоба лічыцца абранай, калі за яе прагаласавала больш за палову ад агульнай колькасці ўдзельні_ц Агульнага Сходу. Калі па выніках галасавання ніводны з кандыдата_к не набраў патрэбнай колькасці галасоў, адбываецца другі тур, у якім прымаюць удзел дзве кандыдат_кі, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў у першым туры. Калі ў першым туры некалькі кандыдата_к атрымалі роўную колькасць галасоў такім чынам, што вызначыць двух кандыдата_к з найбольшай колькасцю галасоў немагчыма, адбываецца паўторнае галасаванне ў першым туры. Асоба, якая атрымала ў другім туры простую большасць галасоў, лічыцца абранай на пасаду.

75. Абранне астатніх сябро_вак Рады адбываецца з ліку сябр_овак Асацыяцыі (за выключэннем абрана_й Прэзідэнт_кі), у залежнасці ад колькасці вылучаных кандыдата_к наступным чынам:

а) пры вылучэнні колькасці кандыдата_к, роўнай колькасці вакантных пасадаў, Агульны Сход ажыццяўляе галасаванне па кожн_ай кандыда_тцы асобна. Асоба лічыцца абранай у склад Рады, калі за яе прагаласавала больш за палову ад прысутных удзельні_ц Агульнага Сходу. Калі асоба не атрымала неабходнай колькасці галасоў, удзельні_цы Агульнага Сходу павінны вылучыць кандыдат_ку на гэтую пасаду, па якім адбываецца галасаванне тым жа чынам;

b) пры вылучэнні колькасці кандыдата_к большай за колькасць вакантных пасадаў, адбываецца галасаванне па кожнай вылучанай кандыдатуры асобна. Па выніках галасавання абранымі лічацца асобы згодна з колькасцю вакантных пасадаў, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, але больш за палову галасоў удзельні_ц Агульнага Сходу.

c) у выпадку, калі адначасова некалькі кандыдата_к атрымалі роўную колькасць галасоў, прэтэндуючы на пасаду неабрана_й сябр_оўкі Рады, між імі адбываецца дадатковы тур. Пры гэтым кожн_ая ўдзельніца Агульнага Сходу мае адзін голас. Абран_ай лічыцца кандыдат_ка, як_ая набра_ла найбольшую колькасць галасоў.

d) у выпадку немагчымасці абрання сябр_оўкі Рады, Агульны Сход сваім рашэннем можа змяніць правілы абрання кандыдат_кі у сябр_оўкі Рады.

76. Абранне сяброў_кі Камісіі па этыцы адбываецца з ліку сябр_овак Асацыяцыі ў залежнасці ад колькасці вылучаных кандыдата_к наступным чынам:

а) пры вылучэнні колькасці кандыдата_к, роўнай колькасці вакантных пасадаў, Агульны Сход ажыццяўляе галасаванне па кожным кандыда_тцы асобна. Асоба лічыцца абранай у склад Камісіі па этыцы, калі за яе прагаласавала больш за палову ад прысутных удзельні_ц Агульнага Сходу. Калі асоба не атрымала неабходнай колькасці галасоў, удзельні_цы

Агульнага Сходу павінны вылучыць кандыдат_ку на гэтую пасаду, па якім адбываецца галасаванне тым жа чынам;

b) пры вылучэнні колькасці кандыдата_к большай за колькасць вакантных пасадаў, адбываецца галасаванне па кожнай вылучанай кандыдатуры асобна. Па выніках галасавання абранымі лічацца асобы згодна з колькасцю вакантных пасадаў, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, але больш за палову галасоў удзельні_ц Агульнага Сходу.

c) у выпадку, калі адначасова некалькі кандыдата_к атрымалі роўную колькасць галасоў, прэтэндуючы на пасаду неабрана_й сябр_оўкі Камісіі па этыцы, між імі адбываецца дадатковы тур. Пры гэтым кожн_ая ўдзельні_ца Агульнага Сходу мае адзін голас. Абран_ай лічыцца кандыдат_ка, як_ая набрала найбольшую колькасць галасоў.

d) у выпадку немагчымасці абрання сябр_оўкі Камісіі па этыцы, Агульны Сход сваім рашэннем можа змяніць правілы абрання кандыдата_к у сябр_оўкі Камісіі па этыцы.

77. Абраныя сябр_оўкі Камісіі па этыцы абавязаны адразу пасля абрання і не пазней, чым падчас першага паседжання вырашыць, хто з іх будзе выконваць ролю старшыні камісіі.

77[1]. Парадак абрання сябр_овак Арбітража вызначаецца правамоцнымі ўдзельнікамі Агульнага Сходу падчас яго пасяджэння.”

78. Абранне выканаўча_й дырэктар_кі адбываецца па наступных правілах:

a) абраная Рада прапаноўвае на зацвярджэнне перад Агульным Сходам кандыдатуру выканаўча_й дырэктар_кі са згоды апошня_й;

b) удзельні_цы Агульнага Сходу зацвярджаюць ці адхіляюць кандыдат_ку простай большасцю галасоў удзельні_ц Агульнага Сходу;

c) калі Агульны Сход адхіліў кандыдат_ку на пасаду выканаўча_й дырэктар_кі, Радзе прапаноўваецца вылучыць нов_ую кандыдат_ку, пасля вылучэння яко_й адбываецца зацвярджэнне, згодна з пунктам b).

79. Абранне сябро_вак Назіральнай Камісіі адбываецца з ліку сябр_оваак Асацыяцыі ў залежнасці ад колькасці вылучаных кандыдата_к наступным чынам:

a) пры вылучэнні колькасці кандыдата_к, роўнай колькасці вакантных пасадаў, Агульны Сход ажыццяўляе галасаванне па кожным кандыда_тцы асобна. Асоба лічыцца абранай у склад Назіральнай Камісіі, калі за яе прагаласавала больш за палову ад прысутных удзельні_ц Агульнага Сходу. Калі асоба не атрымала неабходнай колькасці галасоў, удзельні_цы Агульнага Сходу павінны вылучыць кандыдат_ку на гэтую пасаду, па як_ай адбываецца галасаванне тым жа чынам;

b) пры вылучэнні колькасці кандыдата_к большай за колькасць вакантных пасадаў, адбываецца галасаванне па кожнай вылучанай кандыдатуры асобна. Па выніках галасавання абранымі лічацца тыя асобы, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, але больш за палову галасоў удзельні_ц Агульнага Сходу, адпаведна колькасці вакантных пасадаў.

c) у выпадку, калі адначасова некалькі кандыдата_к атрымалі роўную колькасць галасоў, прэтэндуючы на пасаду неабрана_й сябр_оўкі

Назіральнай камісіі, між імі адбываецца дадатковы тур. Пры гэтым кожн_ая ўдзельні_ца Агульнага Сходу мае адзін голас. Абран_ай лічыцца кандыдат_ка, як_ая набрала найбольшую колькасць галасоў.

d) у выпадку немагчымасці абрання сябр_оўкі Назіральнай камісіі, Агульны Сход сваім рашэннем можа змяніць правілы абрання кандыдата_к у сябр_оўкі Назіральнай камісіі.

80. Абраныя сябр_оўкі Назіральнай камісіі абавязаны адразу пасля абрання і не пазней, чым падчас першага паседжання, вырашыць, хто з іх будзе выконваць ролю старшыні камісіі.

81. Адкліканне сябр_овак Асацыяцыі з займаных імі пасад адбываецца на Агульным Сходзе, які склікаецца па ініцыятыве не менш як ⅓ сябр_овак Асацыяцыі. Рашэнне аб адкліканні прымаецца простай большасцю (больш за 1/2) ўдзельнікаў Агульнага Сходу. Выбары нова_й сябр_оўкі Асацыяцыі на вызваленую пасаду праводзяцца ў адпаведнасці з выкладзенымі вышэй правіламі.

## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Дадзены Статут прыняты на Агульным Сходзе Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека 6 верасня 2023 года ў г.Вільнюсе. Статут уступае ў сілу з моманту яго прыняцця Беларускай асацыяцыяй адвакатаў правоў чалавека.

г. Вільнюс
6 верасня 2023 года